УДК 821.161.3-311.6*В. Быкаў:177.6-055.2

Л. А. Стома

Навук. кір. – Т. А. Фіцнер, канд. філал. навук, дацэнт

# ВЫТОКІ ГЕРАІЧНАГА Ў ЖАНЧЫНЕ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ТВОРАЎ ВАСІЛЯ БЫКАВА)

У артыкуле прааналізаваны асобныя творы В. Быкава, у якіх аўтар па-мастацку асэнсоўвае вытокі геранчнага ў жанчыне падчас ВАв. Мэта даследавання – прасачыць адметнасць выяўлення вытокаў гераізму жаночых постацей у прозе В. Быкава. Навізна даследавання абумоўлена адсутнасцю грунтоўных напрацовак па заяўленай тэме. У артыкуле сцвярджаецца, што вытокі гераічнага ў жанчыне – у адчуванні пэўнай глыбіннай «народнай праўды», у спрадвечнай народнай міласэрнасці і ўласнай спагадзе. Гераізм жанчыны – і ў мацярынскім стаўленні да ўсяго жывога. Яна часам маральна мацнейшая за мужчыну, бо больш здольная захаваць сваю самасць, сутнасную жыццёвую мудрасць і духоўную моц.

У ваенных творах Васіля Быкава жанчына паўстае як крыніца жыцця, як выток кахання. Яна не толькі дае новае жыццё (як радыстка Клава Шарохіна, аповесць «Воўчая зграя»), але і ўзвышае чалавека ў крытычныя хвіліны жыцця, дапамагаючы заставацца чалавекам. Апрача гэтага, у быкаўскай трактоўцы жанчына бачыцца увасабленнем сталай мудрасці, апорай пэўнай агульначалавечай маральнай трываласці ў віхуры усеагульнага бязладдзя ды гора. Быкаў схіляўся да той думкі, што, відаць, «ужо на генетычным узроўні жанчына мацнейшая за мужчыну» [1]. Абгрунтоўваючы гэту ідэю ў адным з інтэрвʻю, ён казаў: «І далей, у працэсе нялёгкага існавання, [жанчына] найменш паддаецца ўздзеянню асяроддзя, захоўвае сваю самасць…» [1]. І гэтая яе ўласцівасць найперш выяўляецца ў крытычныя моманты. «Мужчына не мае такой пэўнасці, бо дужа шмат магутных акалічнасцяў уплываюць на яго: улады, партыі, войска, дзе з ім толькі і робяць, што ламаюць, 103 становяць на калені» [1], – меркаваў пісьменнік. Таму не дзіва, што на старонках прозы Васіля Быкава, дзе ў асноўным дзейнічаюць мужчыны, шмат паказана і жаночай мужнасці, самаахвярнасці ды жыццёвай стойкасці. У многіх яго творах гераіні ахвяруюць уласным жыццём дзеля выратавання іншых. Такой паўстае маці Войціка (аповесць «У тумане»), Дзёмчыха (аповесць «Сотнікаў»), Сцепаніда (аповесць «Знак бяды»). Галоўных і другасных гераінь такога плану многа у прозе Быкава, таму што многа іх было і ў ваенны час. Пісьменнік і ў гэтым не адступае ад жыццёвай праўды. Жанчыны-артылерысткі, санінструктары, снайперы, радысткі, лётчыцы, партызанскія сувязныя, урэшце – жанчыны-маці, што ратавалі сваіх і чужых дзяцей на акупіраванай фашыстамі тэрыторыі. Жанчыны, што на сваіх плячах вынеслі даваеннае ліхалецце і калгасную няшчымніцу – гэта пра іх лёс піша пісьменнік і за кожнай бачыць цяжкі лёс сваёй ахвярніцы-маці. Так, цётка Ядзвіга (аповесць «Абеліск») бярэ на сябе адказнасць, рызыкуючы жыццём сваёй сямʻі, клапаціцца пра акружэнцаў. Такіх вобразаў цэлая галерэя. Гэта і жанчына, якая дапамагае ратавацца акружэнцу Азевічу, які ёй у даваенныя гады, у запале класавай барацьбы, зрабіў нямала кепскага (аповесць «Сцюжа»), і маці Войціка (аповесць «У тумане»), што адмовілася засланіцца сынам, калі паліцаі ўзялі яе ў заложнікі: каб хлопец не надумаў здацца сам, пайшла на смерць, каб ён застаўся жыць. Гэта і «цётка Бараноўская» (раман «Карʻер»), што выхадзіла параненага Агеева. Вытокі гераізму гэтых жанчын – мацярынскае стаўленне да ўсяго жывога: «Я ж разумею. У мяне ж таксама сын быў, зрэшты, вельмі на вас падобны. Такі вось чубаценькі. Дваццаць шосты гадок...» [2, с. 28]. Серафімка (аповесць «Бліндаж») ратуе ў сваім бліндажы, што ператвараецца ў своеасаблівы «Серафімчын каўчэг», людзей самых розных нацыянальнасцей і светапоглядаў – савецкага лейтэнанта, былога настаўніка, яўрэя-прадпрымальніка і нямецкага оберяфрэйтара, якіх прыбіла да яе селішча віхурай вайны і якім так ці інакш патрэбна дапамога. І яе дабро, яе гераізм абарочваецца тым, што яна становіцца ахвярай. Іх гераізм будзённы і зліваецца са звычайным будзённым клопатам – напаіць, накарміць, абагрэць, перавязаць рану, дагледзець. Тым самым жаночыя вобразы быкаўскіх аповесцей толькі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

яшчэ больш падкрэсліваюць бесчалавечнасць вайны, бо гэтыя гераіні, як правіла, фізічна безабаронныя, найчасцей становяцца ахвярамі і гінуць. Пісьменнік выводзіць лѐс жанчыны і праявы яе гераізму на Литературоведение 104 першы план свайго філасофскага асэнсавання праблемы жыцця, маральнага выбару, подзвігу. У Быкава галерэя жаночых персанажаў, і галоўных, і другарадных, уяўляе сабой узор гераізму, выток якога можна знайсці ў тым, што яны – носьбіты нейкай глыбіннай, генетычнай «народнай праўды». Так, выключнай мужнасцю надзелена Аўгіння Вокунь (Дзѐмчыха) у аповесці «Сотнікаў». Гэты вобраз надзвычай трагічны: Дзѐмчыха павінна бязвінна загінуць, пакінуўшы сіротамі малых, старэйшай з якіх толькі дзевяць гадоў. Яе муж на фронце, і, каб пракарміцца самой і дзецям, жанчына вымушана перабівацца выпадковымі заробкамі ў суседзяў. Яе мэта – усяго толькі выжыць, зберагчы дзяцей ды дацягнуць да канца вайны. Аднак здараецца непрадбачанае: лѐс выпадкова прыводзіць да яе хаты няпрошаных і небяспечных для таго часу гасцей – партызанаў Сотнікава і Рыбака, што выправіліся ў вѐску за прадуктамі. Эпізод першага з'яўлення незнаѐмцаў у хаце Дзѐмчыхі шматзначны і выпісаны аўтарам падрабязна. Самой гаспадыні не было дома, яна днямі працуе, і «гасцей» сустрэла дзевяцігадовая дзяўчынка, што ў адсутнасць маці даглядае малодшых брата і сястрычку. Малыя падзяліліся з партызанамі апошняй бульбінай з гуркам. Дзѐмчыха, што неўзабаве прыходзіць з працы, спярша злуецца, застаўшы ў сваѐй хаце няпрошаных гасцей: ѐй і без такога клопату цяжка жывецца. «Хіба цяпер жонкі ведаюць, дзе іх мужыкі? Пакідалі во, жыві як хочаш» [3, с. 30], – раздражнѐна адказвае яна Рыбаку, усім сваім выглядам паказваючы, што не рада небяспецы хаваць чырвоных партызан, з-за якіх ѐй не паздаровіцца. Рыбак і сам разумее, што збіраецца ўзваліць на плечы гэтай жанчыны непасільную ношу. Але паступова, убачыўшы стан параненага Сотнікава, што страчвае прытомнасць, сжальваецца, разумеючы, што партызаны ў цяжкім становішчы, ім патрэбна дапамога, і відавочна пачынае спагадаць. Яе хмуры, стомлены твар «пачаў мякчэць» [3, с. 30], у словах і рухах з'яўляюцца дзелавітасць і ўпэўненасць. Аўтар паказвае, што ў ѐй пачынаюць гаварыць спрадвечная народная міласэрнасць і жаночая спагада, якія і падказваюць Дзѐмчысе, як менавіта ѐй належыць сябе паводзіць у такой нялѐгкай сітуацыі. Яна дае Сотнікаву ватоўку, каб таму было лягчэй ляжаць, цѐплую ваду і кавалак палатна для перавязкі раны. А калі ў хату пачынаюць стукацца паліцаі, дазваляе партызанам схавацца на гарышчы. Безумоўна, дапамагаючы Рыбаку і Сотнікаву, жанчына ўсведамляе, што рызыкуе не толькі ўласным жыццѐм, але і жыццѐм сваіх дзяцей. Ды толькі, відаць, інакш гэта беларуская жанчына не магла сябе 105 паводзіць. Яна выяўляецца чалавекам з моцным характарам, што да канца не скараецца трагічным абставінам і непазбежнасці лѐсу. Яна нават спрабуе абараніць Сотнікава, калі таго збіваюць паліцаі. Паліцаі адрываюць яе ад дзяцей і разам са знойдзенымі ў яе хаце партызанамі вязуць у мястэчка на допыт ды здзекі, распачаўшы іх ужо па дарозе туды. Аднак Аўгіння не маўчыць, праклінаючы і іх, і Гітлера. Фашысцкі паслугач, следчы – здраднік Партноў – тлумачыць паводзіны ўпартай Дзѐмчыхі паводле свайго разумення: ѐн лічыць яе «партызанскім агентам». У вязніцы ламаецца нават той, хто дагэтуль быў паказаны быццам бы самым трывалым сярод персанажаў – Рыбак. Аднак не зламалася Дзѐмчыха. Яна спачатку дапамагае хавацца партызанам, хоць сэрца абліваецца крывѐю па сваіх дзецях. А ў крытычны момант, калі на кон пастаўлена жыццѐ, адмаўляецца выдаць тых, хто хаваў яўрэйскую дзяўчыну Басю. У яе стае цеплыні збалелага сэрца, каб сагрэць ім чужое дзіця перад вісельняй. Пісьменнік паказвае, праз якія пакуты даецца ѐй гэта рашэнне: тут і крык, і боль, і роспач. Але жанчына не ідзе на змову з паліцаямі. Да апошніх хвілін жыцця, перад самай шыбеніцай, думае маці-пакутніца пра сваіх дзяцей. Але ў яе няма сумненняў у правільнасці сваіх дзеянняў. Яе народны, глыбінны маральны інстынкт, яе сумленне, якое не залежыць ад знешніх прычын, асуджае здрадніцтва. Тут пісьменнік выходзіць на праблему, якая стварае супярэчнасць і робіць зразумелым выток гераізму нашай жанчыны на вайне. Гэта абсалютная несумяшчальнасць у адной прасторы сваіх і чужынцаў – нацыстаў і іх прыслужнікаў, хто перайшоў, ад страху ці свядома, на бок бесчалавечных чужынцаў. Такую несумяшчальнасць арганічна адчуваюць і выказваюць многія быкаўскія гераіні. Так, выразна гэта сфармулявана, напрыклад, вуснамі Зосі Нарэйкі (аповесць «Пайсці і не вярнуцца»). Яна,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

нягледзячы на сваѐ каханне да Антона Галубіна, калі ѐн надумаў перакінуцца да гітлераўцаў дзеля захавання свайго жыцця, паверыўшы, як многія, што перамога за імі, абураецца яго пазіцыяй і шчыра кажа: «Антон, ты не разумееш... Каму жыць не хочацца? Я ж зусім і не жыла яшчэ, можна сказаць. Але што ж ты прапануеш? Ісці да фашыстаў? Што ж гэта такое? Гэта горш, чым нават смерць. Тут трэда згубіць сумленне. Яны ж чума дваццатага стагоддзя. Супраць іх увесь свет. З імі ж жыць немагчыма, яны ж звяры... Мы – людзі. І мы ніколі не пагодзімся з імі, нават калі яны і пераможуць. Ты кажаш, што няма выбару. Выбар ѐсць: або мы, або яны. Во ў чым наш выбар» [4, с. 132]. Галубін, себялюбец і эгаіст, такога простага і яснага сэнсу не разумее: на яго погляд, дзяўчыну проста «напрапагандавалі». Литературоведение 106 Гераіні Быкава заўжды стаяць перад выбарам у тых ці іншых экстрэмальных ваенных варунках. Але кожны раз іх выбар – на карысць чалавечнасці, уласнай годнасці і сумлення. Такая ж выснова, і гэтак жа рашуча, была выказана з не меншай упэўненасцю галоўнай гераіняй аповесці «Знак бяды» Сцепанідай Багацька. Псіхалогія яе вобраза і яе мужа Петрака, як вядома, была часткова распрацавана Васілѐм Быкавым на падставе згадак пра лѐс і характары яго ўласных бацькоў. І калі матчына далікатнасць была ім перададзена Петраку, то бацькава рашучасць была замацавана за Сцепанідай. Гэта моцная жанчына, апынуўшыся перад сваім выбарам, абірае шлях згарэць разам са сваѐй хатай, чым скарыцца перад нелюдзямі. Характар Сцепаніды шчыры і рашучы. Вытокі яе гераічных паводзінаў мы бачым у самой сутнасці яе асобы. У пэўным сэнсе гэта сялянская жанчына была справядлівай і настойлівай праўдашукальніцай на працягу ўсяго жыцця. Так, яшчэ да вайны, у часы калектывізацыі, яна рабіла спробы рэагаваць на несправядлівасць, але атрымлівалася ў яе гэта не заўсѐды. Ды з акупантамі інакшага выйсця ў яе не стае. Яна не бачыць, як і Зося Нарэйка, мажлівасці суіснавання людзей і звяроў. У людзей у такім выпадку няма выбару – выбар адзін. Прыхадні паводзяць сябе так, што Сцепанідзе не ўяўляецца магчымым ісці з імі на кампраміс. Яна пачынае ім супраціўляцца адразу, як толькі яны нахабна забіраюць на яе селішчы ўсѐ больш улады. Пры гэтым жанчына добра разумее, наколькі яна слабая ў гэтым сваім пратэсце. Яна здольная, з аднаго боку, абвострана адчуваць праўду і чалавечнасць, а з другога – усякую крыўду і нялюдскасць. Сваім баявітым характарам яна нібыта дапаўняе свайго Петрака, усѐ жыццѐ стрыманага і ціхмянага. Быкаў паслядоўна паказвае, як душа і свядомасць Сцепаніды выспяваюць да рашучага пераканання не ісці нават на дробязныя ўступкі ворагам, будуць тое немцы, ці паліцаі. Усѐ роўна, гэта для яе нелюдзі, якім трэба помсціць, каб ні хвіліны яны не адчувалі тут сябе гаспадарамі становішча. Пры гэтым трэба разумець, што кожная дробязная няўступка немцам – насамрэч у выніку абарочваецца несуразмерна значнай ахвярай для самой Сцепаніды. Так, жанчына вырашае не даць малака немцам – і немцы забіваюць карову, тым самым прыносіцца ў ахвяру вельмі дарагая ў такі час і ўвогуле дарагая для яе сэрца карміліца. Потым яна выкрадае ў немца-кухара вінтоўку і кідае яе ў калодзеж. Страта для ворага невялікая, затое назаўтра немцы пер170трэсваюць у пошуках гэтай вінтоўкі ўсю істопку, забраўшы пры гэтым скрыпку Петрака. 107 Пасля гібелі Петрака, апрытомнеўшы пасля збіцця да паўсмерці, яна вырашае помсціць паліцаям, немцам – усім тым, хто разбурыў яе жыццѐ, і без таго дагэтуль гаротнае, за сваѐ селішча, за сваю зямлю. У абмен на ацалелае парася яна купляе ў хітрага і запаслівага Карнілы неразарваную бомбу, каб узарваць мост, які ўжо быў пабудаваны нанова. Паліцаі выйшлі на яе, і жанчына здзяйсняе свой апошні гераічны ўчынак. Акружаная паліцаямі, жанчына зачыняецца ў істопцы. Пад грукат, крыкі і стрэлы паліцаяў Сцепаніда знутры аблівае істопку газай і падпальвае сябе. Думаючы, што бомба ўнутры, паліцаі разбягаюцца. Ніхто не тушыць полымя, баючыся выбуху. Палаючая сялянская пабудова ператвараецца ў сімвал непрыступнай крэпасці, дзе Сцепаніда застаецца нherеперамоганай і недасягальнай ні для каго з ворагаў. Многія гераіні Быкава, сапраўды высакародныя, далікатныя і пяшчотныя, гінуць у ваенным ліхалецці. Гэтак было і ў рэальным жыцці, дзе жанчыны гінулі вельмі часта, як найменш падрыхтаваныя да таго пекла, якім сталася вайна. Васіль Быкаў ненавідзеў вайну як самае праклятае з усяго прыдуманага ліха на зямлі і выкрываў яе жорсткасць сурова і праўдзіва. І з найбольшай выразнасцю і сілай гэта праўда выявілася менавіта праз пакутніцкі і гераічны лѐс жанчыны. Гераізм жанчыны, такі натуральны паводле сваіх вытокаў, што зыходзіць з

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

яе сутнасці і прызначэння, у шэрагу выпадкаў робіць яе ахвярай чужой волі, здрады, палахлівасці. Так, у аповесці «Мѐртвым не баліць» мы бачым «агонь-дзяўчыну» Кацю Шчарбенка. Яна наўмысна малюецца не «гераічна» знешне, падаецца нават не вельмі прыгожай. Але настолькі ж яна прываблівае сваѐй чалавечай сутнасцю. Рызыкуючы трапіць у мінную пастку, дзяўчына першай кідаецца туды, куды нават мужчыны ступіць не адважваюцца. Яна і рашучая, дзейсная, і спачувальная, міласэрная, калі таго вымагаюць абставіны. «Была б мая ўласць, я б яго – бягом прагнала да Берліна і назад. На Калыму б яго, сабаку! За нашыя мукі! Хай бы памѐрз, папакутаваў, колькі рускі народ пакутуе» [5, с. 18], – кажа яна пра немца. Са спагады да сваіх, з адчування чужога болю як свайго і мусіць браць вытокі, думаецца, яе гераізм. Лѐс Каці трагічны: яна, цяжарная, падрываецца на замінаваным полі. Але справа не ў тым, што гераізм дзяўчыны, як і ўласцівая ѐй смеласць, занадта безразважныя. Прычына знешняя і тыповая для таго часу – бесчалавечны загад асабіста Сахно, які пагнаў іх на міннае поле. Такім чынам, вытокі гераізму жаночых постацей прозы Васіля Быкава варта шукаць у адчуванні імі пэўнай глыбіннай «народнай праўды», а таксама ў спрадвечнай народнай міласэрнасці і ўласна жаночай спагадзе. Вытокі гераізму гэтых жанчын – і ў мацярынскім Литературоведение 108 стаўленні да ўсяго жывога. Іх гераізм будзѐнны і знешне малапрыкметны, зліваючыся са звычайным будзѐнным клопатам аб чалавеку: накарміць, перавязаць раны, суцешыць. Дзейнічаюць у аповесцях В. Быкава ў асноўным мужчыны, але многа паказана і жаночай мужнасці. Болей за тое, яны часам маральна мацнейшыя за самых дужых мужчын, у чым бачыў пісьменнік пэўны закон жыцця, паводле якога жанчына больш здольная захаваць сваю самасць, сутнасную жыццѐвую мудрасць і духоўную моц. Яна выступае захавальніцай агульначалавечай маральнай трываласці ў віхуры вайны. І падчас выбару жанчына ў прозе Быкава не вагаецца. Яна абірае адзіны шлях – чалавечнасць. Спіс літаратуры 1 Чэрвень з Быкавым: «Жанчына мацнейшая за мужчыну...» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.svaboda.org/a/2063071.html. – Дата доступу: 02.04.2020/ 2 Быкаў, В. У. Кар‘ер: раман / В. У. Быкаў. – Мінск: Маст. літ., 1987. – 302 с. 3 Быкаў, В. У. Выбраныя творы / В. У. Быкаў. – Мінск: Бел. кнігазбор, 2004. – 669 с. 4 Быкаў, В. У. Пайсці і не вярнуцца: аповесці / В. У. Быкаў. – Мінск: Маст. літ., 1979 – 261 с. 5 Быкаў, В. Мѐртвым не баліць / В. Быкаў. – Мінск: Медыял, 2014. – 604 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ